**Сёння Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу спаўняецца 70 год**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (1149) • 19 снежня 1976 г. • Цана 2 кап. • Газета выходзіць з 1935 г.



Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. БРЭЖНЕЎ.

## ТАВАРЫШУ БРЭЖНЕВУ ЛЕАНІДУ ІЛЬІЧУ

Дарагі Леанід Ільіч!

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР горача і сардэчна вітаюць Вас — вернага сына савецкага народа, выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы і міжнароднага камуністычнага руху, палымянага барацьбіта за мір і сацыяльны прагрэс, паслядоўнага марксіста-ленінца — у дзень Вашага сямідзесяцігоддзя.

Ваша нястомная і плённая дзейнасць, Леанід Ільіч, з'яўляецца натхняючым прыкладам самаадданага служэння Радзіме, ленінскай партыі, справе камунізму. На ўсіх пасадах, на якія вылучала Вас партыя, у вырашэнні ўсіх адказных задач, якія яна Вам даручала, Вы заўсёды з гонарам апраўдвалі і апраўдваеце аказанае давер'е.

Ваша невычарпальная энергія, партыйная прынцыповасць, непарыўная сувязь з жыццём народа маюць глыбокія вытокі. Уступіўшы ў строй вялікай арміі працы ў юныя гады, Вы, Леанід Ільіч, разам з мільёнамі равеснікаў упэўнена ішлі наперад па адкрытаму Савецкай уладай шляху, спалучаючы работу на заводзе з настойлівым авалоданнем ведамі. Жыццё ў рабочым калектыве дало Вам глыбокае разуменне дум і спадзяванняў працаўнікоў. Рабочы, інжынер, партыйны работнік, Вы былі заўсёды на ўдарных напрамках развіцця сацыялістычнай індустрыі і калгаснага ладу ў гады першых пяцігодак.

Калі разбойніцкі напад фашысцкай Германіі паставіў нашу Радзіму перад смяротнай небяспекай, Вы з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны сталі ў рады воінаў і змагаліся да поўнай перамогі.

Бітва за Каўказ, легендарная «Малая зямля», выгнанне гітлераўскіх акупантаў з Крыма, з Украіны, вызваленне Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі — такія вехі слаўнага шляху армій, у бітвах якіх адзначаны і Ваш ратны подзвіг і асабістая мужнасць, за што Радзіма ўдастоіла Вас звання Героя Савецкага Саюза.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Вы ў якасці першага сакратара Запарожскага, а затым Днепрапятроўскага абкомаў партыі аддавалі свае сілы аднаўленню гэтых буйных індустрыяльных цэнтраў, прымалі непасрэдны ўдзел у адраджэнні праслаўленай Днепрагэс імя У. І. Леніна і гіганта металургіі — «Запарожсталі».

Працаўнікі Малдавіі і Казахстана добра ведаюць, як многа працы, ініцыятывы і настойлівасці ўклалі Вы, Леанід Ільіч, узначальваючы партыйныя арганізацыі гэтых саюзных рэспублік, у развіццё іх прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры. Пераўтварэнне цалінных зямель Казахстана ў буйную жытніцу краіны ўвайшло ў яе гісторыю выдатнай эпапеяй, у якую ўпісаны і Ваша імя, Ваш выдатны ўклад.

У наступныя гады, будучы членам Палітбюро, сакратаром ЦК КПСС і займаючыся пытаннямі цяжкай, абароннай прамысловасці, будаўніцтва, Вы адыгралі выдатную ролю ў росце індустрыяльнага і навукова-тэхнічнага патэнцыялу Радзімы, ва ўмацаванні яе абароннай магутнасці, у арганізацыі даследаванняў па асваенню космасу. Радзіма высока ацаніла Вашы заслугі, Леанід Ільіч, прысвоіўшы Вам званне Героя Сацыялістычнай Працы.

На пасадзе Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Вы нямала сіл аддалі справе далейшага ўмацавання Савецкай дзяржавы і развіццю сацыялістычнай дэмакратыі.

Высокім прызнаннем партыяй і народам Вашага аўтарытэту як кіраўніка ленінскага тыпу з'явілася выбранне Вас, дарагі Леанід Ільіч, на кастрычніцкім (1964 г.) Пленуме Цэнтральнага Камітэта партыі Першым сакратаром ЦК КПСС, а пасля завяршэння XXIII з'езда КПСС Цэнтральны Камітэт выбраў Вас Генеральным сакратаром ЦК.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

**Аб узнагароджанні Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы таварыша Брэжнева Леаніда Ільіча ордэнам Леніна і другім медалём «Залатая Зорка»**

За выдатныя заслугі перад Камуністычнай партыяй і Савецкай дзяржавай у камуністычным будаўніцтве, актыўную, плённую дзейнасць па ўмацаванню міру і бяспекі народаў, за вялікі асабісты ўклад у справу перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне, ва ўмацаванне эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць Генеральнага сакратара ЦК КПСС Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы таварыша **Брэжнева** Леаніда Ільіча ордэнам **Леніна і другім медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ПАДГОРНЫ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль.
18 снежня 1976 г.

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

**Аб узнагароджанні Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС, Старшыні Савета Абароны СССР Маршала Савецкага Саюза Брэжнева Л. І. Ганаровай зброяй з залатым адбіткам Дзяржаўнага герба СССР**

За выдатныя заслугі ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны і ўдасканаленні Узброеных Сіл СССР узнагародзіць Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС, Старшыню Савета Абароны СССР, Маршала Савецкага Саюза **Брэжнева** Леаніда Ільіча **Ганаровай зброяй з залатым адбіткам Дзяржаўнага герба СССР.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ПАДГОРНЫ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль.
18 снежня 1976 г.

## Масква, Крэмль, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжневу

**ДАРАГІ ЛЕАНІД ІЛЬІЧ!**

**Шматтысячны калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна горача і сардэчна віншуе Вас, вернага ленінца, выдатнага дзеяча КПСС і Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, нястомнага і паслядоўнага барацьбіта за мір і сацыяльны прагрэс, з 70-годдзем з дня нараджэння. Прыемна і радасна ўсведамляць нам у гэтыя незабыўныя дні, што шматлікія старонкі Вашай надзвычайнай, шматграннай дзейнасці звязаны з Савецкай Беларусіяй.**

**Рады паведаміць, што студэнты, прафесарска-выкладчыцкі састаў і супрацоўнікі універсітэта адзначаюць Ваш слаўны юбілей новымі поспехамі ў вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай рабоце.**

**Ваш заклік павышаць эфектыўнасць і якасць на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва стаў дэвізам усёй дзейнасці нашага калектыву.**

**Жадаем Вам, дарагі Леанід Ільіч, добрага здароўя, асабістага шчасця, нястомнай энергіі, многіх год жыцця і плённай працы дзеля дабрабыту нашага вялікага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва!**

**ПАРТКОМ,**
**РЭКТАРАТ,**
**МЯСЦКОМ,**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**

# ТАВАРЫШУ БРЭЖНЕВУ ЛЕАНІДУ ІЛЬІЧУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

З таго часу, вось ужо больш як 12 гадоў, усе галоўныя падзеі ў жыцці нашай партыі і народа, поспехі ленінскай унутранай і знешняй палітыкі Савецкага Саюза звязаны з Вашай плённай дзейнасцю на пасадзе Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС. Вы, Леанід Ільіч, уносіце вялікі ўклад у распрацоўку і ажыццяўленне ленінскага генеральнага курсу партыі, правільнасць і справядлівасць якога пацвярджаецца ўсім ходам развіцця нашай Радзімы і сусветнага гістарычнага працэсу.

Гэта былі гады магутнага, няўхільнага ўздыму стваральнай энергіі народных мас Савецкага Саюза, якія пад мудрым кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і яе Цэнтральнага Камітэта на чале з Вамі, Леанід Ільіч, ажыццявілі грандыёзныя па размаху і глыбіні сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, будаўніцтва развітога сацыялістычнага грамадства. Гераічнай працай партыі і народа створаны гіганцкі матэрыяльны і духоўны патэнцыял Савецкай Айчыны. Выдатнай па сваіх палітычных і эканамічных выніках з'явілася дзевятая пяцігодка, якая абазначыла буйны этап у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, у павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа, у забеспячэнні абароны і бяспекі краіны.

У гэтыя гады становіцца ўсё больш маналітным саюз рабочага класа, калгаснага сялянства, народнай інтэлігенцыі, усё больш цеснай і непарушнай — брацкая дружба народаў Савецкага Саюза. Савецкая дзяржава стала агульнанароднай, і ў паслядоўным развіцці сацыялістычнай дэмакратыі, усёй нашай грамадскай сістэмы пераканаўча праяўляецца вялікая сіла гістарычнай рэвалюцыйнай творчасці народных мас.

XXV з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза азнаменаваў уступленне нашай Радзімы на новыя гістарычныя рубяжы велічнага пастyпальнага руху наперад, да камунізму.

Праграмным дакументам партыі з'яўляецца «Справаздача Цэнтральнага Камітэта КПСС і чарговыя задачы партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі», з якой выступілі Вы, Леанід Ільіч. У ёй дадзены глыбокі і ўсебаковы аналіз важнейшых працэсаў нашай эпохі, рэвалюцыйна - пераўтваральнай дзейнасці партыі і народа, ходу сусветнага рэвалюцыйнага працэсу, раскрыты іх заканамернасці і перспектывы, вызначаны кардынальныя задачы ленінскага ўнутранага і знешнепалітычнага курсу на сучасным гістарычным этапе.

Нястомныя клопаты праяўляе наша партыя і яе Цэнтральны Камітэт на чале з Вамі, Леанід Ільіч, аб пастаянным паляпшэнні жыцця савецкага народа. Выпрацаваныя з'ездам Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады і прыняты ў адпаведнасці з імі дзесяты пяцігадовы план маюць галоўнай задачай няўхільны ўздым народнага дабрабыту на аснове дынамічнага і прапарцыянальнага развіцця грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадуктыўнасці працы, усямернага паляпшэння якасці работы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

XXV з'езд КПСС горача і аднадушна адобрыў палітычную лінію і практычную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта КПСС, Справаздачны даклад ЦК, прыняўшы як кіраўніцтва да дзеяння вызначаныя Вамі палажэнні і задачы. З'езд даў магутны імпульс новаму ўздыму палітычнай і працоўнай актыўнасці савецкіх людзей, якія ўспрынялі рашэнні з'езда як праграму сваёй дзейнасці. Яны яшчэ цясней згуртаваліся вакол партыі і яе Цэнтральнага Камітэта.

З поспехамі камуністычнага будаўніцтва непарыўна звязана ўмацаванне аўтарытэту і ўплыву Савецкага Саюза на сусветнай арэне. Міжнароднае становішча нашай Радзімы трывалае як ніколі. Няспынна развіваюцца наша брацкая дружба і супрацоўніцтва з краінамі сусветнай сацыялістычнай садружнасці, спаяныя баявым саюзам камуністычных партый на прынцыпах марксізму-ленінізму, пралетарскага інтэрнацыяналізму. Умацоўваецца згуртаванасць, якая звязвае КПСС з камуністычнымі, рабочымі партыямі, з усімі атрадамі ўдзельнікаў сусветнага фронту барацьбы супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Духам узрастаючай салідарнасці, дружбы і ўзаемаразумення прасякнуты адносіны Савецкага Саюза з краінамі, што сталі на шлях развіцця, з усімі народамі, якія змагаюцца за палітычную і эканамічную незалежнасць, за справу міру і свабоды.

У апошнія гады наша Радзіма, няўхільна прытрымліваючыся міралюбівага ленінскага курсу, разам з брацкімі краінамі сацыялізму і іншымі міралюбівымі сіламі дабілася поспехаў ва ўмацаванні міру і бяспекі народаў. Вызначаная Вамі, Леанід Ільіч, на XXIV з'ездзе КПСС Праграма міру стала магутным пазітыўным фактарам аздараўлення міжнародных адносін, павароту да разрадкі напружанасці і ўсё больш трывалага ўсталявання прынцыпаў мірнага суіснавання паміж дзяржавамі з розным сацыяльным ладам, за якія змагаўся У. І. Ленін.

З натхненнем успрынялі савецкія людзі, усе сумленныя людзі на зямлі вызначаную Вамі на XXV з'ездзе КПСС праграму далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў, у якой увасоблена адзіная воля КПСС і савецкага народа — адстаяць і ўмацаваць справу міру і прагрэсу чалавецтва, ліквідаваць пагрозу сусветнай тэрмаядзернай вайны.

Савецкія людзі ганарацца тым, што кожны крок знешнепалітычнай дзейнасці Цэнтральнага Камітэта КПСС, Палітбюро ЦК і Вашай асабіста, Леанід Ільіч, прысвечаны дасягненню гэтых высакародных, гуманных мэт. Натхнёнай, страснай барацьбой за мір Вы здабылі сабе ўдзячнасць усіх людзей добрай волі на зямлі, якая знайшла выражэнне ў прысуджэнні Вам Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» і ўзнагароджанні Залатым медалём міру імя Ф. Жаліо-Кюры.

Рэакцыйныя імперыялістычныя сілы ўсяляк тармозяць працэс разрадкі міжнароднай напружанасці і працягваюць гонку ўзбраенняў. Таму Савецкая дзяржава, партыя і яе Цэнтральны Камітэт праяўляюць неаслабныя клопаты аб падтрыманні на належным узроўні абароны нашай Радзімы. Асабіста Вы, Леанід Ільіч, на пасадзе Старшыні Савета абароны ўносіце вялікі ўклад у будаўніцтва нашых слаўных Узброеных Сіл.

Навуковай асновай усёй дзейнасці нашай партыі, яе ўнутранай і знешняй палітыкі з'яўляецца марксісцка-ленінскае вучэнне, якое творча прымяняецца і развіваецца. Вялікі Ваш, Леанід Ільіч, асабісты ўклад у далейшае творчае развіццё партыяй марксісцка-ленінскай навукі, асабліва ў дастасаванні да ўмоў будаўніцтва развітога сацыялізму і пераходу да камунізму, у глыбокую распрацоўку ключавых праблем эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны. Вызначаныя Вамі палажэнні па пытаннях развіцця сацыялістычнай індустрыі, аграрнай палітыкі, накіраванай на ўсямернае развіццё сельскай гаспадаркі, павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, спалучэння дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялістычнага ладу, удасканалення грамадскіх адносін, камуністычнага выхавання працоўных, па праблемах міжнародных адносін і задачах знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы маюць асноватворчае значэнне на сучасным этапе развіцця нашай Радзімы.

Дарагі Леанід Ільіч!

Вы заслужылі глыбокую павагу, любоў і давер'е камуністаў і ўсіх савецкіх людзей, прысвяціўшы ўсе свае сілы беззапаветнаму служэнню партыі і народу. Вы з гонарам выконваеце ўскладзеную на Вас партыяй місію, узначальваючы яе баявы штаб — Цэнтральны Камітэт. Партыя і народ ведаюць, з якой сапраўды невычарпальнай энергіяй, прынцыповасцю і дальнабачнасцю Вы ажыццяўляеце кіраўніцтва вырашэннем складаных і адказных задач камуністычнага будаўніцтва.

Вы праяўляеце пастаянныя клопаты аб далейшым павышэнні кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў нашым грамадстве, умацаванні яе сувязей з народнымі масамі, усталяванні і развіцці ленінскіх прынцыпаў і норм у жыцці партыі і грамадства, якія з'яўляюцца ўмовай нашых поспехаў.

Дарагі друг і таварыш!

Для ўсіх Вашых таварышаў, усіх барацьбітоў за справу камунізму Вы з'яўляецеся прыкладам таго, якім павінен быць камуніст-ленінец. Уся Ваша дзейнасць прасякнута глыбокай верай у творчыя сілы партыі і народа, сардэчнай блізкасцю і павагай да людзей працы. Вас вызначае выдатнае ўменне натхняць і згуртоўваць людзей, арганізоўваць дружную, згуртаваную работу Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Наша Камуністычная партыя, яе Цэнтральны Камітэт, Палітбюро ЦК і Вы асабіста, Леанід Ільіч, дабіліся ўсталявання і развіцця ў савецкім грамадстве абстаноўкі сапраўднага калектывізму, таварыскага давер'я, павагі і разам з тым патрабавальнасці і прынцыповасці, што садзейнічае росквіту ўсіх творчых сіл чалавека — будаўніка камунізму. Савецкія людзі адказваюць партыі, Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Вам, Леанід Ільіч, пачуццямі глыбокай сардэчнай падзякі.

Выказваючы гэтыя пачуцці і горача віншуючы Вас, дарагі Леанід Ільіч, з днём Вашага сямідзесяцігоддзя, сардэчна жадаем Вам добрага здароўя і шчасця, новых поспехаў у Вашай нястомнай і плённай дзейнасці на карысць савецкага народа, усіх працоўных, у імя перамогі светлых ідэй міру і камунізму.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА**

**ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР**

**САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР**



**МАСКВА. 30 красавіка 1976 года. Сустрэча таварыша Л. І. Брэжнева з рабочымі Маскоўскага аўтамабільнага завода імя І. А. Ліхачова (вытворчае аб'яднанне ЗІЛ).**

Фотахроніка ТАСС.

# Генеральнаму сакратару Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза таварышу Леаніду Ільічу БРЭЖНЕВУ

Дарагі Леанід Ільіч!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў Беларускай ССР, выказваючы аднадушны парыў і волю, шчырыя пачуцці камуністаў, усіх працоўных рэспублікі, у сувязі з Вашым 70-годдзем шлюць Вам, вернаму прадаўжальніку справы вялікага Леніна, прызнанаму кіраўніку Камуністычнай партыі і савецкага народа, выдатнаму палітычнаму дзеячу сучаснасці, самыя гарачыя і сардэчныя віншаванні.

У Вашай легендарнай біяграфіі, дарагі Леанід Ільіч, —гісторыя станаўлення і росквіту Краіны Саветаў, гіганцкай стваральнай дзейнасці партыі і народа, летапіс нашай гераічнай эпохі. Верны сын партыі, яе мужны салдат і нястомны працаўнік, Вы ўсе свае сілы, вопыт і веды аддаеце служэнню высакародным ідэалам камунізму. У працоўным кіпенні першых савецкіх пяцігодак, на вогненных рубяжах Вялікай Айчыннай вайны, у незабыўнай цаліннай эпапеі, на ніве партыйнай і дзяржаўнай работы складваліся і ўсебакова праявіліся ўласцівыя Вам выдатныя якасці палітычнага дзеяча ленінскага тыпу, барацьбіта высокага рэвалюцыйнага абавязку, глыбокай прынцыповасці, чалавека невычарпальнай энергіі і душэўнай шчодрасці.

Яркае абліччa кіраўніка бальшавіцкага складу, Ваш арганізатарскі талент і палітычная мудрасць, дарагі Леанід Ільіч, з асаблівай уражальнай сілай раскрыліся на высокай пасадзе Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Узначальваючы ленінскі штаб нашай партыі, Вы пры распрацоўцы і вырашэнні пытанняў унутранага і міжнароднага жыцця нязменна апіраецеся на калектыўны розум і вопыт партыі, Палітбюро ЦК КПСС, найлепшым чынам выражаючы і ўвасабляючы неадольную магутнасць і камуністычную накіраванасць Саюза ССР, народаў-братоў нашай вялікай шматнацыянальнай Радзімы. З вашым імем непарыўна звязаны самыя запаветныя спадзяванні і надзеі шырокіх народных мас, вы здабылі ўсеагульнае прызнанне як выдатны дзеяч сусветнага рабочага і камуністычнага руху, як самаадданы барацьбіт за мір і камунізм на зямлі.

З глыбокім адабрэннем і ўдзячнасцю камуністы, усе працоўныя рэспублікі ўспрымаюць Вашу настойлівасць і паслядоўнасць ва ўсталяванні і развіцці ў партыі і краіне сапраўды ленінскага стылю жыцця і працы, стварэнні той сапраўды творчай абстаноўкі, у якой прыемна і радасна жыць і працаваць.

Уласцівы Вам сталы навуковы падыход да вырашэння буйнамаштабных палітычных, эканамічных і сацыяльных праблем развітога сацыялізму, актуальных міжнародных пытанняў ярка праявіўся ў справаздачных дакладах на з'ездах нашай партыі і іншых Вашых выступленнях, якія з'яўляюцца буйным укладам у скарбніцу марксізму-ленінізму.

Распрацаваная пад Вашым кіраўніцтвам натхняючая праграма камуністычнага будаўніцтва нясе ў сабе велізарны зарад сацыяльнага аптымізму, перакананасці ў невычарпальнасці магутных сіл савецкага народа, разняволеных перамаганосным Кастрычнікам. Яе ажыццяўленне стала справай гонару, справай жыцця і працы кожнага савецкага чалавека.

Камуністы, усе працоўныя Беларускай ССР урачыста запэўніваюць Вас, дарагі Леанід Ільіч, што яны аддадуць усе свае сілы ўвасабленню ў рэальнасць велічных прадвызначэнняў XXV з'езда КПСС, Вашых асабістых указанняў і парад.

У знамянальны дзень Вашага слаўнага юбілею рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя Савецкай Беларусі выказваюць Вам пачуцці шчырай любві, бязмернай павагі і ўсенароднай удзячнасці, якія ідуць з глыбінь сэрцаў, за Ваш рэвалюцыйны подзвіг, за Вашу нястомную кіпучую дзейнасць у імя далейшага працвітання сацыялістычнай Айчыны, у імя шчасця людзей працы.

Жадаем Вам, дарагі Леанід Ільіч, моцнага здароўя, новых творчых сіл і велізарных поспехаў у Вашай тытанічнай працы на карысць міру і камунізму.

**САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ П. МАШЭРАЎ**

**СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР Ф. СУРГАНАЎ**

**СТАРШЫНЯ САВЕТА МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР Ц. КІСЯЛЁЎ.**

# УСЕ ЧАТЫРЫ ГАДЫ ВАЙНЫ

Запіска старшыні савета ветэранаў 18-й арміі маёру ў адстаўцы А. М. Капенкіну была па-вайсковаму лаканічнай: «Аляксей Міхайлавіч! Хачу ўдзельнічаць у сустрэчы з сябрамі - аднапалчанамі. Л. Брэжнеў. 11. 5. 76». І вось зноў ён з намі—начпаарм-18, аб якім удзельнік баёў пад Наварасійскам Герой Савецкага Саюза Сяргей Аляксандравіч Барзенка пісаў: «Начальнік палітаддзела цэментаваў маральную стойкасць войск, не раз праяўляў асабістую храбрасць і жалезную вытрымку».

На нашу сустрэчу 12 мая гэтага года Леанід Ільіч прыехаў у форме Маршала Савецкага Саюза. Традыцыйны даклад аб зборы, абдымкі, пацалункі, моцныя поціскі рук... Наш аднапалчанін як быў на фронце, так і зараз—просты ў абыходжанні, даступны, шчодры на добрае слова, вясёлы жарт.

Нас гэта не здзіўляла. Яго аднапалчане ды і ўсе ўдзельнікі вайны добра памяталі словы Леаніда Ільіча на мітынгу, прысвечаным уручэнню ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» гораду-герою Новарасійску. «Калі чалавеку,—гаварыў ён, — давялося быць непасрэдным удзельнікам якой-небудзь выдатнай падзеі свайго часу, падзеі, якая вызначае важнейшы рубеж у сусветнай гісторыі, гэта застаецца ў яго свядомасці на ўсё жыццё. Для старэйшага пакалення нашай партыі такімі падзеямі былі Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і грамадзянская вайна. Для нас з вамі, для майго пакалення—Вялікая Айчынная вайна».

Так, жорсткая бітва з фашызмам працягвае жыць у нашай свядомасці. Не сцёрлася яна і з памяці Леаніда Ільіча. Ён памятае дэталі многіх баёў, называе месцы сустрэч з аднапалчанамі, імёны загінуўшых. «Нечалавечае напружанне сіл і поўная самаадданасць, — гаворыць ён, — такім быў стан усіх нас—удзельнікаў гэтай буйнейшай з войн у гісторыі».

Ён мае права так гаварыць. Усе чатыры гады—ад першых тыдняў да апошніх дзён вайны знаходзіўся ў Дзейнічаючай арміі. на адказнай палітычнай рабоце. Займаючы пост намесніка начальніка Палітупраўлення Паўднёвага фронту, ён спазнаў горыч адступлення і зведаў радасць першых перамог. У сакавіку 1942 года на гімнасцёрцы палкавога камісара Брэжнева заблішчаў ордэн Чырвонага Сцяга. Гэтай узнагароды ён быў удастоены за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях пад Барвянковам, калі нашы войскі прарвалі абарону праціўніка і прайшлі да 100 кіламетраў у заходнім напрамку.

Потым баі пад Растовам-на-Доне, Батайскам. Памятны загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага № 227 ад 28 ліпеня 1942 года У ім прама было сказана: «Адступаць далей—значыць загубіць сябе і загубіць разам з тым нашу Радзіму... Ні кроку назад без загаду вышэйшага камандавання. Такі заклік нашай Радзімы». У тыя неймаверна цяжкія дні брыгадны камісар Брэжнеў, зараз ужо намеснік начальніка Палітупраўлення Чарнаморскай групы войск, не толькі аказвае дапамогу палітарганам групы, непасрэдна на пярэднім краі вядзе палітычную работу, растлумачвае байцам патрабаванні гэтага важнага дакумента, а і фарміруе адзін з чатырох спецыяльных ударных атрадаў па 500 камуністаў і камсамольцаў у кожным. Атрады патрэбны былі для ўмацавання войск на небяспечных напрамках, іх рыхтавалі да бою найбольш аўтарытэтныя палітработнікі.

У гэты перыяд Леаніду Ільічу даводзіцца часта працаваць у часцях і падраздзяленнях, укамплектаваных папаўненнем з закаўказскіх рэспублік і рэспублік Сярэдняй Азіі. Многія воіны дрэнна валодалі рускай мовай. Але гэта не перашкаджала наладжванню цесных кантактаў палітработніка з салдацкімі масамі. Яны бачылі ў Брэжневе паўнапраўнага прадстаўніка партыі, кіраўніка-інтэрнацыяналіста, старэйшага сябра і настаўніка. Настойлівая арганізатарская і партыйна-палітычная работа дала цудоўныя вынікі. Гэтыя часці, як і іншыя, паказалі ўзоры стойкасці ў абароне, рашучасць і націск у наступленні.

Разгарэліся баі за Каўказ. Вораг спынен, але становішча застаецца складаным. І зноў палкоўнік Брэжнеў у гушчыні падзей, на пярэднім краі, на вастрыі атакі. Калі ў лютым 1943 года дэсантны атрад маёра Цэзара Кунікава высадзіўся на заходняй ускраіне Новарасійска, палкоўнік Брэжнеў стаў ледзь не першым прадстаўніком Палітупраўлення групы войск на гэтым шчодра палітым крывёю савецкіх патрыётаў маленькім плацдарме, якому суджана было ўвайсці ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай «Малая зямля».

(Заканчэнне на 4-й стар.).




**МАСКВА. 24 чэрвеня 1945 года. Парад Перамогі. Генерал-маёр Л. І. Брэжнеў сярод баявых таварышаў. Фотахроніка ТАСС.**



**КІЕЎ. 1973 год. Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў сярод піянераў горада.**

**Фотахроніка ТАСС.**

# УСЕ ЧАТЫРЫ ГАДЫ ВАЙНЫ



**ВЕРАСЕНЬ 1974 ГОДА.** Знаходжанне Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў горадзе-героі Новарасійску.
**НА ЗДЫМКУ: Л. І. БРЭЖНЕЎ** з ветэранамі вайны.

Фотахроніка ТАСС.

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).**

Праз месяц Леанід Ільіч, каб быць бліжэй да войск, настаяў на сваім пераводзе на пасаду начальніка палітаддзела 18-й арміі. На гэтым пасту зноў і ў поўнай меры раскрыліся яго выдатныя якасці армейскага палітработніка і ўжо выразна праявіліся рысы буйнога палітычнага дзеяча.

Мяне, былога намесніка начпаарма, часта пытаюць: як гэтыя рысы Леаніда Ільіча праяўляліся ў франтавой абстаноўцы? Дзе іх вытокі? Звычайна я раблю невялікі экскурс цяпер ужо ў далёкае перадваеннае мінулае. Яшчэ ў кастрычніку 1936 года газета Забайкальскай заеннай акругі «На боевом посту» пісала: «Вось таварыш Брэжнеў Л. І.— камуніст, сын рабочага, сам рабочы з Днепрапятроўска. Выдатнік вучобы. З першых дзён стаў адным з арганізатараў барацьбы за выдатныя паказчыкі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Асабістым прыкладам вёў за сабой іншых таварышаў. Будучы стажорам-камандзірам узвода, дабіўся таго, што узвод другую задачу па стральбе выканаў на выдатна. За год знаходжання ў арміі ён атрымаў пяць падзяк і адну прэмію. У цяперашні час тав. Брэжнеў працуе палітруком гэтага ж падраздзялення».

Аднак вернемся да пачатку сорак трэцяга. Разгром і паланенне 330-тысячнай арміі фашыстаў пад Сталінградам, бяспрыкладны гераізм і вайсковае майстэрства сталінградцаў служылі натхняючым прыкладам для абаронцаў Каўказа.

Начпаарм-18 Леанід Ільіч Брэжнеў шмат увагі ўдзяляе рабоце ў войсках на «Малой зямлі». Не было тыдня за 225 дзён кровапралітных баёў, калі ён не пускаўся б у небяспечнейшае «падарожжа» па начным моры на адным з судзёнышкаў «цюлькінага флоту» (так мы называлі сейнеры, якія курсіравалі паміж размяшчэннем нашых войск і «Малой зямлёй»), каб быць побач з малазямельцамі.

Часцей за ўсё ў такіх пераходах палкоўнік Брэжнеў стаяў на капітанскім мосціку. Калі агонь фашыстаў станавіўся асабліва шчыльным і чарговае папаўненне дэсанта пачынала цісннуцца да надбудоў, ён падбадзёрваў навічкоў: «Весялей, таварышы! Глядзіце, справа па борту — ілюмінацыя, сапраўдны феерверк. Вышэй галаву!».

Мы, палітаддзельцы, не раз прасілі яго быць паасцярожней. Куды там! «Нічога!»—гаварыў Леанід Ільіч і зноў адпраўляўся ў самае пекла. Але аднойчы ўсё-такі бяда падсцерагла начпаарма. Сейнер, на якім ён ішоў на «Малую зямлю», падарваўся на міне. Узрыўная хваля кінула Леаніда Ільіча за борт. «Жывы застаўся таму, — дзяліўся ён потым у гутарках,—што не разгубіўся. На вадзе галоўнае—не губляцца. Трэба спакойна трымацца, таварышы заўжды выручаць»,

Паяўленне начальніка палітаддзела на «Малой зямлі» радавала воінаў. Прама ў акопах, на агнявых рубяжах, ён уручаў партыйныя білеты, расказваў аб перамозе пад Сталінградам. А калі патрабавалася, браў у рукі зброю і разам з усімі вёў бой. Начпаарм пастаянна праяўляў клопат аб параненых,

«Асабліва памятныя,—успамінаў Леанід Ільіч праз трыццаць гадоў,—красавіцкія дні, калі вораг атрымаў загад — любой цаной разграміць і скінуць у мора малазямельцаў. Успамінаецца дзень 17 красавіка 1943 года. У гэты дзень фашысты кінулі ў наступленне супраць нашых войск на «Малой зямлі» вялізныя масы авіяцыі, артылерыі і некалькі дывізій пяхоты. Гарэла зямля, плавіўся метал, рушыўся бетон. Восем дзён і начэй адбівалі шалёны націск ворага героі «Малой зямлі». Незлічоныя атакі гітлераўцаў разбіліся аб жалезную стойкасць нашых воінаў.

Пасля гэтых баёў фашысты назвалі малазямельцаў—трыжды камуністамі...».

Вярнуўшыся з «Малой зямлі» або з іншага ўчастка пярэдняга краю, Леанід Ільіч звычайна збіраў работнікаў палітаддзела, каб расказаць аб убачаным, падзяліцца думкамі, даць параду. «За што мы, палітработнікі, у адказе?» — пытаўся ён і тут жа адказваў: «За ўсё! Але галоўны наш клопат — высокі баявы дух, здаровы маральны стан, пастаянная боегатоўнасць і баяздольнасць войск... Мы павінны ведаць, ці правільна засвоілі байцы баявую задачу, у якім стане іх зброя, амуніцыя і абмундзіраванне, ці сытыя яны, як спалі, ці ведаюць апошнія падзеі на фронце, у краіне...»

Начальнік палітаддзела ўмеў так згуртаваць і нацэліць калектыў аддзела, усяго палявога кіраўніцтва арміі, што кожны адчуваў асабістую адказнасць за даручаную справу, пастаянны партыйны ўплыў. Не, наш начпаарм ніколі не падмяняў і не апякаў службовых асоб. У яго былі цудоўныя ўзаемаадносіны з камандуючым арміяй генералам К. Н. Леселідзэ, членам Ваеннага савета генералам С. Е. Калоніным, начальнікам штаба генералам Н. А. Паўлоўскім. Ён заўсёды знаходзіў агульную мову з усімі, таму што непахісна стаяў на партыйных пазіцыях, быў прынцыповы ў вялікім і малым.

Яскрава праяўлялася асаблівае ўменне Леаніда Ільіча знаходзіць агульную мову з усімі катэгорыямі асабістага саставу. Выклікаць да сябе прыхільнасць людзей, прыкмячаць іх поспехі ў баі, заражаць воінаў імкненнем да новых подзвігаў — адна з характэрных рыс яго баявой дзейнасці ў тыя цяжкія гады.

Кола яго клопатаў і інтарэсаў заўсёды было вельмі шырокае. Леанід Ільіч аналізаваў абстаноўку на фронце, думаў аб перспектывах развіцця баявых дзеянняў. Да гэтага часу памятаю размову ў палітаддзеле ў дні, калі канкрэтны план Новарасійскай аперацыі яшчэ не быў распрацаван. «Топчамся на адным месцы,—з засмучэннем гаварыў ён. — З вялікімі стратамі бяром вышыню адну, другую... А толку малавата. Трэба сканцэнтраваць сілы і ўдарыць па занятай фашыстамі частцы Новарасійска. Гэта ж — ключ да ўсёй «Блакітнай лініі»...

Не ведаю, ці дзяліўся начпаарм у тыя дні сваімі думкамі з камандаваннем, але вельмі хутка мы, палітаддзельцы, зразумелі, што рашаючыя баі набліжаюцца. «Настойліва рыхтаваць людзей да штурму горада з мора і сушы! — даў нам указанне Леанід Ільіч. — Мы ж дэсантная армія! Нашым законам ёсць і будзе рух наперад! Растлумачвайце гэта кожнаму ад камдзіва да салдата!»

І час настаў. У цесным узаемадзеянні з іншымі арміямі, авіяцыяй і флотам войскі 18-й у імклівым кідку вызвалілі Новарасійск. «А калі мы дружна і смела ўдарылі па Новарасійску і разграмілі там ворага, — з усмешкай успамінае Леанід Ільіч, — то ўжо, гаворачы па сакрэту, і дагнаць яго цяжка было — так ён бег па Тамані».

Закончылася вызваленне Паўночнага Каўказа. Нашу армію тэрмінова перакінулі пад Кіеў. Да ордэна Чырвонай Зоркі, якім палкоўнік Брэжнеў быў узнагароджан у сакавіку 1943 года, прыбавіўся ордэн Айчыннай вайны І ступені — за Новарасійскую аперацыю.

Абстаноўка ў раёне Жытоміра была вельмі складанай. Пасля таго, як быў адбіт контрудар ворага, войскі 1-га Украінскага фронту перайшлі ў наступленне. 18-я армія дзейнічала на кірунку галоўнага ўдару фронту. Здаралася і нам, палітработнікам, быць у ланцугу атакуючых. З якім захапленнем глядзелі салдаты на начпаарма! Яго асабісты прыклад натхняў, клікаў наперад. А ў перапынку паміж баямі ён збіраў камандзіраў і палітработнікаў, дзяліўся ўражаннямі, патрабаваў шырокай і ўсебаковай прапаганды баявога вопыту, ініцыятыўных дзеянняў воінаў.

Пасля вызвалення Правабярэжнай Украіны войскі накапілі вопыт наступлення на раўніннай мясцовасці. Армія папоўнілася новымі часцямі і злучэннямі. Пачалася падрыхтоўка да Карпацка-Ужгарадскай аперацыі. Зноў — горы, перавалы, густыя лясы, забалочаныя адхоны... Начпаарм увесь час у войсках — удзельнічае ў зборах камандзіраў і палітработнікаў, выступае перад разведчыкамі і сапёрамі, дзеліцца вопытам, арганізуе забеспячэнне воінаў спецыяльным абмундзіраваннем для дзеянняў у гарах.

«Л. І. Брэжнеў, — успамінае генерал-палкоўнік А. І. Гасціловіч, у той час камандзір 17-га гвардзейскага стралковага корпуса, — некалькі разоў прыязджаў да нас у корпус, цэлыя дні праводзіў у падраздзяленнях пярэдняга краю. Ён шчодра дзяліўся з камандзірамі багатым вопытам вядзення баёў у гарах, набытым у бітвах пад Туапсэ, ля Гойтхскага перавала, пад Наварасійскам і на Тамані. Ён нязменна падтрымліваў у штабе арміі ўсе нашы просьбы, накіраваныя на павышэнне баявой магутнасці корпуса, разам з Ваенным саветам арганізоўваў гэтую дапамогу. Гэта вельмі дапамагала ў рабоце і ўсяляла ўпэўненасць ва ўласных сілах».

Але не толькі аб мужнасці і майстэрстве армейскага палітработніка хацелася б расказаць. Гэта, калі можна так сказаць, толькі адзін бок справы. Бо вайна часта ставіла пытанні, якія чыста ваеннымі метадамі рашыць немагчыма.

Талент палітычнага кіраўніка, які раскрыўся ў Леаніда Ільіча яшчэ ў перадваенныя гады на пасту сакратара Днепрапятроўскага абкома партыі, у гады вайны зазіхацеў новымі гранямі. Пасля вызвалення Закарпацця яму давялося весці вялікую палітычную і арганізацыйную работу, так сказаць, мірнага плана. Асабліва пры падрыхтоўцы такіх буйных мерапрыемстваў, як канферэнцыі камуністаў Закарпацкай Украіны, з'езды саюза моладзі, прафсаюзаў і іншых. Генерал-маёр Леанід Ільіч Брэжнеў (гэта званне яму прысвоена 2 лістапада 1944 года) разам з мясцовымі таварышамі рыхтаваў гэтыя мерапрыемствы, часта выступаў на розных нарадах і мітынгах, сустракаўся з насельніцтвам...

У пачатку лістапада 1944 года, перад баямі за Чэхаславакію, А. І. Гасціловіч быў назначан камандуючым нашай арміяй. Пры знаёмстве з войскамі, з камандзірамі і палітработнікамі, пры рашэнні баявых задач ён адразу ж адчуў падтрымку і дапамогу генерала Брэжнева. «Асабліва вялікая гэта дапамога, — успамінае Антон Іосіфавіч, — была ў рабоце з насельніцтвам Закарпацкай Украіны, а ў далейшым і з насельніцтвам брацкай Чэхаславакіі».

Трэба заўважыць, што работа гэта пачалася задоўга да выхаду савецкіх войск на дзяржаўную мяжу. Яшчэ летам сорак чацвёртага, выступаючы перад афіцэрамі фарміраваўшагася ў тылавым раёне нашай арміі 1-га чэхаславацкага корпуса, Леанід Ільіч казаў: «Дарагія чэхаславацкія сябры, нашы баявыя таварышы, вы можаце быць упэўнены, што савецкія воіны не пашкадуюць сіл і самаго жыцця ў імя перамогі над ворагам. Чэхаславакія будзе свабоднай!»

У канцы 1944-га і ў пачатку 1945 года наша армія разам з арміямі 4-га Украінскага фронту, вызваліўшы шэраг раёнаў Венгрыі і Польшчы, пачалі баі ў Чэхаславакіі. Разам з намі з пачатку студзеня 1945 года плячо ў плячо змагаліся і воіны 1-га чэхаславацкага корпуса.

Некаторыя таварышы часам цікавяцца: чаму традыцыйная сустрэча ветэранаў нашай арміі праводзіцца 12 мая, праз тры дні пасля свята Перамогі? Сакрэту ў тым няма. Менавіта ў гэты дзень незабыўнага сорак пятага года 18-я армія закончыла апошнюю аперацыю супраць гітлераўскіх захопнікаў на тэрыторыі Чэхаславакіі. З тых пор і існуе традыцыя сустрэч аднапалчан, якую мы зберагаем свята.

**С. ПАХОМАЎ,**
**палкоўнік у адстаўцы, былы намеснік начальніка палітаддзела 18-й арміі.**

**(«Правда», 14 снежня 1976 года).**

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 04613 Зак. № 1811.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 32-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.